№ 94 (4141)

2 снежня 2016 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.


www.nv-online.info

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

«Народная Воля»
в Twitter
www.twitter.com/narodnaya_volya
в Facebook
www.facebook.com/nv.online.info
в Vkontakte
www.vk.com/nvonlineinfo

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!



БЕЗ РУЖОВЫХ АКУЛЯРАЎ

Аляксандр КЛАСКОЎСКІ,
спецыяльна
для "Народнай Волі"

«Крэатыў» ад Чаргінца

Днямі на III з'ездзе Саюза пісьменнікаў Беларусі яго старшыня Мікалай Чаргінец казырнуў лічбамі: калі стваралі арганізацыю, было 150 чалавек, цяпер яна вырасла да шасці соцень. Дакладная лічба – 606. Мяне яна сапраўды ўразіла. Цэлы батальён! Але пры гэтым прозвішчы, за рэдкім выключэннем, нічога не гавораць нават тым, хто сочыць за навінкамі айчыннай літаратуры. Затое прэтэнзій на льготы ў СПБ аж цераз край.

Трэба зазначыць, што сёння, у эпоху масавай культуры ды інтэрнэту, друкаванае мастацкае слова сапраўды апынулася ў незайздросных умовах. Шмат хто разважае: нашто несці грошы ў кнігарню, калі амаль што ўсё можна на дурніцу спампаваць з Сеціва? Новыя пакаленні з іх кліпавым мысленнем падселі на сурагаты, прымітыўнае чытво ды відовішчы. Таму само па сабе пытанне дзяржаўнай падтрымкі высокай культуры, творчых асоб цалкам лагічнае. Але ж, па-першае, лаяльнаму саюзу пісьменнікаў і так грэх скардзіцца; па-другое, падтрымка мусіць быць справядлівай, без дыскрымінацыі тых, чые творы ці грамадская дзейнасць уладзе супраць шэрсці. У Беларусі ж рэжым выразна падзяліў пісьменніцкую грамаду менавіта паводле прынцыпу адданасці (калі не шчырай, то хаця б паказной). Адным – пернікі, іншым – калі не пуга, то дуля.

"Разам з дзяржаўнай падтрымкай мы маем спонсарскую дапамогу, атрымалі і дазвол прэзідэнта на тое, каб самім зарабляць грошы", – дакладваў на з'ездзе Чаргінец. Ён падкрэсліў, што кіраўнік дзяржавы вызваліў Саюз пісьменнікаў і Літфонд ад падаткаў. Ну дык што яшчэ трэба? А трэба, аказваецца, каб на карысць іх суполкі адлічвалася яшчэ і некалькі працэнтаў ад продажу замежнай літаратуры ды прадукцыі недзяржаўных выдавецтваў. Гэта што, яшчэ адзін падатак звыш тых, што напрыдумвала апошнім часам улада?

Ашаламляльная ідэя Чаргінца абурыла прыватных выдаўцоў, якія і так працуюць на свой страх ды рызыку, а іншым разам падпадаюць і пад прэс палітызаванага пераследу, як той самы Ігар Логвінаў. Апошні саркастычна зазначыў: а ці не танней будзе разагнаць Саюз пісьменнікаў, які ўзначальвае спадар Чаргінец?

Тут варта згадаць, што суполка, за якой замацавалася рэпутацыя праўладнай, узнікла напрыканцы 2005 года праз раскол некалі адзінага пісьменніцкага саюза. Лаяльныя да ўлады творцы тлумачылі, што праз стварэнне новай структуры хочуць, маўляў, ачысціцца ад палітыканства (мелася на ўвазе крытычнае стаўленне шэрагу аўтарытэтных літаратараў да ўсталяванага ў краіне аўтарытарнага рэжыму).

Насамрэч жа за тым расколам і стварэннем лаяльнай арганізацыі як супрацьвагі "апазіцыйнай" выразна чыталася менавіта палітычная гульня ўлад. Трапіўшы ў апалу, "стары" Саюз беларускіх пісьменнікаў страціў дзяржаўную падтрымку, пазбавіўся Дома літаратара, зведаў дыскрымінацыю. А вось тыя, што ўзнялі сцяг лаяльнасці, атрымалі ад Аляксандра Лукашэнкі звыш іншых даброт яшчэ і выключнае права выкарыстоўваць у назве арганізацыі слова "Беларусь". Але ж хочацца, як бачым, усё болей прывілей ды льгот. На якой падставе? За тое, што "правільныя", падтрымліваюць "генеральную лінію"? Але ж ці ў гэтым місія творцы, ці гэтым вымяраюцца яго заслугі?

Наадварот, творчасць па сваёй сутнасці не цярпіць аковаў. З сівых часоў майстры мастацкага слова раз-пораз траплялі ў няміласць да грозных уладароў, а то і ахвяравалі жыццём, бо творчае сумленне на дазваляла пець алілую рознага кшталту "намеснікам бога на зямлі". Тут справа не ў дэструктыўнасці і не ў палітыканстве, а ў тым, што творчасць – гэта палёт свабоднага духу. І таму сумленны мастак ужо самім пафасам сваіх твораў хоцькі-няхоцькі кідае выклік уладзе, якая імкнецца свабоду ў грамадстве прыціснуць, абмежаваць.

Прырода ж беларускага рэжыму такая, што ён хоча камандаваць усім – эканомікай, прэсай, культурай. Эканоміку ручным кіраваннем ужо дабілі да абуха. На сумныя казённыя газеты збяднелы народ не хоча падпісвацца. І задума стварыць праўладныя творчыя суполкі ў піку "апазіцыйным" таксама вялікага плёну не дала. Шэдэўры не ствараюцца паводле замовы, канфармізм не спрыяе разняволенаму лунанню творчай думкі. Крэатыў, як бачым, скіроўваецца на прыдумванне новых прывілей.

Карацей, так і не атрымаў Лукашэнка ад лаяльных творцаў новай "Войны и мира", як хацеў. А Нобелеўскай прэміяй летась была ўганаравана зусім не аблашчаная ўладамі Святлана Алексіевіч. Сябрамі апальнага СБП былі таксама ўжо сышоўшыя ад нас славутыя Васіль Быкаў, Янка Брыль, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч.

Кожнае з гэтых імёнаў, на мой погляд, пераважвае ўвесь батальён лаяльных пісьменнікаў, ад якіх, мусіць, ужо і Лукашэнка зарокся чакаць "Войны и мира".

В НОМЕР!

Они борются за наши права

По случаю вручения Германо-Французской премии «За права человека и верховенство закона»

На этой неделе Германия и Франция чествуют мужественных людей, которые по всему миру выступают за права своих сограждан.



Жан-Марк ЭРО,
министр иностранных дел Франции



Франк-Вальтер ШТАЙНМАЙЕР,
министр иностранных дел Германии

Речь идет о таких, как бразильянка Мария да Пенха. После нападения мужа она прикована к инвалидной коляске и сегодня упорно борется за защиту женщин от семейного насилия. Сунита Кришнан из Индии восстала против принудительной проституции и торговли людьми в своей стране, в которой многих молодых женщин, даже девочек, принуждают торговать собой. В Чаде Жаклин Мудейна очень мужественно успешно борется за то, чтобы привлечь бывшего президента Хиссене Хабре к ответу за совершенные им в период пребывания у власти преступления. В Сирии Раед аль-Салех раньше был бизнесменом и занимался торговлей электротехникой. Сегодня он является главой «Белых касок» – группы волонтеров, помогающих вытаскивать людей из-под развалин после авиаударов и восстанавливать разрушенную инфраструктуру. Часто при выполнении этой миссии они рискуют жизнью.

Они из самых разных уголков мира. Различный опыт наложил на них свой отпечаток. Однако одно объединяет их всех: они борются за права ближнего своего.

Для того чтобы отдать должное этим мужественным женщинам и мужчинам во всем мире, мы решили совместно учредить Германо-Французскую премию «За права человека и верховенство закона». На этой неделе мы впервые ее вручаем.

Этой премией мы чтим людей, которые с большой самоотдачей решительно выступают в защиту других. При этом они часто подвергают себя большому риску и работают в тяжелейших условиях. Эти женщины и мужчины заслужили нашей благодарности и поддержки.

Для Германии и Франции защита и продвижение прав человека являются центральным элементом внешнеполитической деятельности. Права человека – это основа и необходимое условие для мира и справедливости в нашем мире. Поэтому мы, как часть мирового сообщества, после ужасных войн XX века объявили о своей приверженности защите и продвижению этих прав – в рамках Организации Объединенных Наций, ОБСЕ, Совета Европы и Европейского Союза.


Сегодня, однако, мы должны предпринять все для того, чтобы эти великие достижения не оказывались под вопросом. Мы видим, что такая угроза их размывания существует в мире, в котором все больше правительств ограничивают общественные и индивидуальные свободы, прикрываясь соображениями безопасности, политической стабильности или культурных особенностей. Мы это наблюдаем и в демократических странах. Там, где арестовывают журналистов, адвокатов и членов неправительственных организаций. Там, где присутствует искушение возвести новые стены, хотя история нас учит, что стены никогда не решают проблем.

Германия и Франция решительно противостоят этому.

Мы оба в ходе наших совместных поездок собственными глазами увидели, что бывает, когда людям отказывают в их фундаментальных правах. Поэтому мы по всему миру выступаем за их защиту и продвижение. При этом мы используем весь спектр инструментов нашей внешней политики – от поддержки местных правозащитников до содействия демократическому государственному управлению, от предотвращения кризисов до постконфликтного восстановления.

Как министры иностранных дел, мы будем упорно продолжать борьбу за то, чтобы не только выявлять случаи нарушения прав человека, но и активно защищать людей от ущемления из основных свобод. Борьбу за права человека мы должны вести совместно и на всех уровнях. А Германо-Французская премия «За права человека и верховенство закона» – символ этого.

В этом году лауреатами премии, предложенными нашими германскими и французскими зарубежными представительствами, являются: Тахмина Рахман (Бангладеш), Олег Гулак (Беларусь), Мария да Пенха (Бразилия), Тун Сарай (Камбоджа), Максимилиен Нго Мбе (Камерун), Беверли К. Джейкобс (Канада), Жаклин Мудейна (Чад), Ван Цяолин (Китай), Монтсеррат Солано Карбони (Коста-Рика), Сунита Кришнан (Индия), Мэри Лоулер (Ирландия), Пьетро Бартоло (Италия), Эва Абу Халаве (Иордания), Сара Белаль (Пакистан) и Валентина Череватенко (Россия). Специальная премия присуждается сирийской организации «Белые каски».



ПАД ГРАДУСАМ

Зіма будзе халоднай

*Сярэдняя тэмпература будзе на 2–4°С ніжэй за норму. Папярэдні прагноз зімовага надвор'я зрабіў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Гідрамета Мінпрыроды **Дзмітрый Рабаў**.*

У снежні сярэдняя тэмпература паветра чакаецца блізкай да нормы (кліматычная норма студзеня -2...-5°С). У параўнанні з лістападам яна панізіцца на 3,3°С. Сярэдняя месячная колькасць ападкаў чакаецца больш за шматгадовыя значэнні (кліматычная норма студзеня – 38 мм).

У студзені сярэдняя тэмпература паветра чакаецца блізкай да нормы, па захадзе краіны на 1°С вышэй за норму (кліматычная норма студзеня -5...-8°С). У параўнанні са снежнем яна панізіцца на 2,7°С. Сярэдняя месячная колькасць ападкаў чакаецца ніжэй сярэдніх шматгадовых значэнняў (кліматычная норма студзеня – 38 мм).

У лютым сярэдняя месячная тэмпература паветра мяркуецца на 0,5°С вышэй за норму, па поўначы краіны на 0,5°С ніжэй (кліматычная норма лютага – -4...-8°С. Сярэдняя месячная колькасць ападкаў таксама чакаецца каля нормы, па паўночным усходзе трохі менш (кліматычная норма лютага – 33 мм).

«Дакладнасць такіх сезонных прагнозаў – 60–70 працэнтаў», – адзначыў Дзмітрый Рабаў.

СТАЛА ВЯДОМА...

Ва ўцёках?

Намеснік кіраўніка адміністрацыі Партызанскага раёна Мінска **Мікалай ПЕТРАМОВІЧ** знаходзіцца... ва ўцёках?

Чыноўнік быў дэпутатам гарсавета, ён член Камуністычнай партыі. Месяц таму ён раптоўна знік. Кажуць, што ён напазычаў грошай...

Ні ў раённай адміністрацыі, ні ў партыйным офісе ўцямнага адказу на пытанне пра месцазнаходжанне Петрамовіча не даюць. Але вядома, што міліцыя ўжо пачала праверку па факце зваротаў пацярпелых.

Пра чыноўніка вядома, што ён вучыўся на следча-экспертным факультэце Акадэміі МУС Беларусі. Закончыў Інстытут дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Працаваў начальнікам упраўлення кадраў на "Інтэграле" і ўзначальваў там БРСМ.

Любоў ЛУНЁВА.

СКОРБИМ...

Умерла дочь Константина Заслонова

На 83-м году жизни умерла Муза Константиновна Заслонова, режиссер-документалист киностудии «Беларусьфильм», старшая дочь легендарного героя Великой Отечественной войны Константина Заслонова.



Муза Константиновна окончила БГУ, а затем ВГИК с красным дипломом. Работала на студии «Летапіс» с 1967 года. О своем отце Муза Константиновна сняла фильм и написала документальный роман «Фамилия». Рассказывала в интервью журналистам: *«Роман о том, как мне моя фамилия давалась и дается. Многим кажется: вот привилегии! Но ведь все наоборот: только входишь в кабинет к чиновнику и называешь себя, он мгновенно норовит перебить тебя – лишь бы ничего не успела попросить. Психологи! Думаете, мою маму кто-нибудь официально поздравляет с Днем Победы? Нет. Зато когда спустя годы она вторично вышла замуж, ох, сколько ей пришлось выслушать: предала мужа-героя!.. Как же – фамилия!»*

Чтобы издать книгу за свой счет, Муза Константиновна продала большую квартиру и купила жилье гораздо скромнее.

Легендарную фамилию Заслонов носит внук героя – Роман, успешный художник, сын младшей дочери Константина Сергеевича. Он живет во Франции, выставляется в Париже. А в прошлом году прошла его выставка в Национальном художественном музее.

Своей семьи у Музы Константиновны не было.

Елена МОЛОЧКО.



ВЕДАЙ НАШЫХ!

Прыгожая сенсацыя

Ужо на першым этапе Кубка свету па біятлоне беларускіх балельшчыкаў нечакана парадавала Дар'я Юркевіч, якая ўпершыню ў кар'еры ўзышла на п'едэстал спаборніцтваў такога ўзроўню.

У індывідуальнай гонцы на 15 км Дар'я заваявала "бронзу", але пры гэтым стала адзінай удзельніцай гонкі, якая ўсе 20 выстралаў адправіла "па прызначэнні"! І п'едэстал стаў ёй своеасаблівай узнагародай за яе працу, бо доўгі час 28-гадовая спартсменка наогул не магла замацавацца ў асноўным складзе зборнай, хаця дэбютавала на Кубку свету яшчэ ў 2010 годзе.

Дарэчы, Даша не толькі біятланістка, якая не скараецца перад перашкодамі ў спартыўным жыцці, але і прыгажуня і чалавек, які ніколі не кіне таварыша ў бядзе. Памятаю, калі падчас аднаго з этапаў Кубка свету на эстафеце сышла з дыстанцыі беларуская біятланістка Надзея Пісарава, многія балельшчыкі абурыліся і накінуліся не толькі на спартсменку, але і на ўсю зборную. Маўляў, калі "не можаце паказваць вынікі, ідзіце на рынак прадаваць памідоры".

Дар'я Юркевіч тады эмацыянальна заступілася за сяброўак па камандзе: *"Можа, вы ў лічбах скажаце, колькі мы атрымліваем? Альбо вам падабаецца выліваць усю нянавісць на іншых людзей з-за свайго жыцця, якое не склалася? І пры гэтым вы хаваеце твар. У Надзеі Пісаравай ледзь сэрца не спынілася на трасе, але ж лепш пракаментаваць навіны з газеты ці інтэрнэту, чым спытаць, што здарылася з чалавекам. Мне здаецца, што такія, як вы, наогул не ўмеюць радавацца поспехам..."*

"Сёння было немагчыма пры такім надвор'і пацэліць 20 выстралаў. Як вам гэта ўдалося?" – запыталіся журналісты ў Дар'і пасля гонкі.

"Бачыце, усё магчыма, – адказала тая. – *Можна сказаць, я стала галоўным сюрпрызам гонкі, бо раней нават у "дзясятку" не трапляла на Кубку свету. Для мяне гэта – шчаслівы шок! Узнагарода за цярпенне".*

Алесь СІВЫ.

РАЗВІТАННЕ



Бывай, Алесь Мікалаевіч!

Сумна, калі такія людзі адыходзяць у іншы свет. Алесь Белакоз – гонар Беларусі. Ён нарадзіўся ў 1928 годзе ў вёсцы Лятькі Ваўкавыскага павета (цяпер Мастоўскі раён). Настаўнік, як кажуць, ад Бога, краязнаўца, грамадскі дзеяч. Выкладаў родную мову і літаратуру ў Гудзевіцкай школе. Па яго ініцыятыве на "малой радзіме" былі створаны ўнікальны дзяржаўны літаратурна-гістарычны музей, які ён узначальваў больш за 30 гадоў.

Аб грамадзянскай пазіцыі Алеся Белакоза яскрава сведчыць такі факт. У 1948 годзе ён, будучы маладым настаўнікам, напісаў на аркушах заклік: "Змагайцеся за незалежнасць Беларусі!" і раскідаў іх з цягніка, калі ехаў у Мінск. У Гродне, рызыкуючы жыццём, разам з сябрам распаўсюджваў антысавецкія ўлёткі.

Лёс падарыў яму магчымасць пазбегнуць арышту і рэпрэсій з боку сталінскай карнай сістэмы. А незалежная Беларусь узнагародзіла яго медалём імя Францыска Скарыны. Ён меў званне заслужанага настаўніка Беларусі.

Спачын Алесь Мікалаевіч знойдзе на могілках вёскі Гудзевічы. Пахаванне прызначана на сёння, 2 снежня.

БЛАГОТВОРИТЕЛЬНОСТЬ

Лявон Вольскі і Зміцер Вайцюшкевіч выступяць у Мінску

Як вядома, да нядаўняга часу гэтыя два музыканты мелі праблемы з выступленнямі ў Беларусі, бо іх прозвішчы былі ў так званых чорных спісах. Але Мінгарвыканкам узгадніў канцэрт культавага «Народнага альбома» з Вольскім і Вайцюшкевічам.



24 лютага 2017 года ў сталічным Prime Hall пройдзе канцэрт культавага праекта 1990-х «Народны альбом». Інфармацыю пра гэта змясціў на сваёй старонцы ў Facebook прадзюсар **Уладзімір Шаблінскі**.

«Апошнія дні лістапада прынеслі добрую навіну. Агенцтвам «Шаблі» атрымана гастрольнае пасведчанне на правядзенне ў «Прайм-холе» канцэрта «Народны альбом». Я выказваю ўдзячнасць кіраўніцтву пляцоўкі за тое, што заключылі з намі дагавор арэнды, галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама – за ўзгадненне мерапрыемства. У год культуры – больш культурных падзей!» – напісаў Шаблінскі.

«Народны альбом» – беларускі музычны праект, прэм'ера якога адбылася ў 1997 годзе. У розныя гады ў праекце бралі ўдзел Лявон Вольскі, Зміцер Вайцюшкевіч, Вераніка Круглова, Кася Камоцкая, Аляксандр Памідораў, Сяргей Ахрамовіч і іншыя выканаўцы з арыгінальнага складу.

Нагадаем, што 4 верасня ў Беластоку на сцэне Падляшскай оперы адбылася прэм'ера юбілейнай версіі «Народнага альбома».

ХОРОШИЙ ПРИМЕР

Отблагодарил

Анатолий Чухно – директор частного предприятия «Еланва», которое занимается производством резино-технических изделий для машиностроения. В августе 2016 года он лежал в отделении нейрохирургии Барановичской городской больницы с травмой головы.

– Врачи и медперсонал очень внимательно и хорошо относились к пациентам, в том числе и ко мне, – цитирует бизнесмена intex-press.by. – *Как-то заведующий отделением рассказал мне, что в отделении не хватает приспособлений для проведения операций на мозге, трепанации черепа. Я решил врачей отблагодарить, чтобы они в дальнейшем могли помогать другим пациентам. Хотелось бы, чтобы эти медицинские приспособления и принадлежности помогали людям, которые будут лежать здесь после меня.*

ДИПКУРЬЕР

Американский дипломат скучает по прошлому

Первый секретарь Посольства США в Беларуси Фредерик Стерн прочитал в Барановичах лекцию об истории Голливуда.

Фредерик Стерн рассказал о самых выдающихся, по его мнению, актрисах золотого века голливудского кино – 30–50-х годов XX века. В своем 30-минутном монологе консул США рассказал о некоторых голливудских кинодивах. Например, выделил актрису Оливию де Хэвилленд, которая снималась в роли Мелани в «Унесенных ветром». В начале 1940-х годов Оливия судилась с компанией «Уорнер бразерз» и выиграла судебное заседание, тем самым добившись творческой свободы для актеров от диктата продюсеров.

Дипломат выступал на английском языке и после лекции с удовольствием ответил на вопросы тех, кто пришел на открытие выставки «Золотой век Голливуда» в Центральной городской библиотеке им.В.Тавлая.

Фредерик Стерн рассказал, что в Беларуси он работает два года и очень скучает по Калифорнии и по тем 20 годам жизни, которые он провел в Америке. Он работает дипломатом более 20 лет и за это время дважды побывал в Индии, был в Ираке, Судане, Египте, Германии, Афганистане, посещал Венгрию, Азербайджан, Украину.

Фредерик Стерн сказал, что не любит современное кино и не смотрит телевидение, предпочитая тому и другому фильмы из его молодости и детства.

SOS!

3 лавы падсудных – у рэанімацыю

Як раней паведамлялася, столінскі фермер Мікалай Бяльчук трымае галадоўку нават у дні судовага працэсу. Стан яго здароўя настолькі пагоршыўся, што з залы суда ён трапіў у рэанімацыю.

Дзядзька Мікалая Зміцер Бяльчук распавёў "Народнай Волі":

– Мы ўсе вельмі хвалюемся за Мікалая. Ён выглядае вельмі кепска. Што там яму робяць у рэанімацыі, не ведаем. Нам нічога не кажуць. Вельмі спадзяёмся, што суд задаволіць хадайніцтва адваката, каб Мікалая адпусцілі пад падпіску аб нявыездзе на час суда. Ён жа нікуды не ўцячэ. З чалавекам і так абышліся як са злачынцам. За што?

Колькі будзе доўжыцца суд, не вядома. На апошняе пасяджэнне канваіры вялі Мікалая пад рукі, бо ён ужо не мог самастойна трымацца на нагах.

Любоў ЛУНЁВА.

СУД

Уладзімір Кондрусь праходзіць псіхіятрычную экспертызу

Яна можа працягнуцца каля месяца.

Нагадаем, што 39-гадовы жыхар гарадскога пасёлка Рудзенск – апошні палітвязень у Беларусі, якога судзяць за ўдзел у масавых беспарадках у снежні 2010 года. Судовы працэс над ім пачаўся 16 лістапада, але адразу быў прыпынены: паведамлялася, што Кондрусь спрабаваў падчас суда перарэзаць сабе вены.

Як стала вядома, зараз яго ўжо перавялі ў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр псіхічнага здароўя ў Навінках для правядзення стацыянарнай псіхолага-псіхіятрычнай экспертызы, якую прызначыў яму суд Маскоўскага раёна Мінска.

На думку праваабаронцаў, існуе пагроза, што Кондруся прызнаюць псіхічна нездаровым. У такім выпадку суд давядзецца адмяніць, а абвінавачанага накіруюць на лячэнне.

ЧУЛІ?

Галіна Малішэўская ўшла...

1 снежня «Комсомольская правда» в Белоруссии» выйшла з абноўленымі выхаднымі дадзенымі, у якіх галоўным рэдактарам замест Галіны Малішэўскай значыцца Андрэй Ляўкоўскі.

Як адзначыў новы рэдактар, рэдакцыйная палітыка газеты не зменіцца. Дарэчы, Ляўкоўскі – чалавек не новы, дагэтуль ён быў намеснікам Малішэўскай.

Сама Малішэўская прычыны сыходу з «КП» не тлумачыць.

Яна з'яўляецца жонкай кіраўніка «Еўрарадыё» Віктара Малішэўскага, перыядычна была госцем Генадзя Давыдзькі ў «Клубе рэдактараў».

ТАМ, ЗА КРАТАМІ

Расстрэльваюць...



Міжнародная дэмакратычная грамадскасць і еўрапейскія палітыкі пераканаўча просяць беларускія ўлады ўстанавіць маратарый на прывядзенне ў дзеянне смяротных прыгавораў.

Факты апошняга часу сведчаць пра тое, што да голасу з-за мяжы Мінск пакуль не прыслухаўся. 5 лістапада 2016 года ў следчым ізалятары №1 г.Мінска быў расстраляны Генадзь Якавіцкі. Такі прыгавор яму вынес Мінскі абласны суд. На яго рахунку двайное забойства людзей – у 1990 і ў 2015 гадах. У першым выпадку смяротны прыгавор быў заменены на 15 гадоў турэмнага зняволення.

Забойцы павінны несці суровае пакаранне. Але ж у многіх краінах прыйшлі да высновы, што прысуд па прынцыпе "кроў за кроў" не адпавядае сучаснаму мысленню чалавецтва і не дае жаданых вынікаў. Беларусь пакуль прытрымліваецца іншага погляду. А таму з пачатку года ў дзеянне прыведзены ўжо некалькі смяротных прыгавораў.

Максім ЛЕГЧАНКА.

ЗДАРЭННІ

Аўтобус з пасажырамі сутыкнуўся з фурай

Здарэнне адбылося ўчора раніцай у Мінску на вуліцы Сяліцкага. На шчасце, усе засталіся жывыя.

Як паведаміла прэс-афіцэр ДАІ Заводскага раёна **Таццяна Лапко,** 56-гадовы кіроўца аўтобуса быў няўважлівы, што і стала прычынай сутыкнення з прыпаркаванай фурай DAF. На яго склалі адміністрацыйны пратакол.

ТЫМ ЧАСАМ

У ДТЗ пад Баранавічамі адбойнік наскрозь прабіў «Рэно»

Аварыя адбылася ўчора на аб'язной дарозе, якая злучае трасы М1 і Р91.

Мужчына ехаў на аўтамабілі «Рэно» з боку М1 і заснуў за рулём. Пры ўздыме на мост праз чыгуначнае палатно машына вылецела на сустрэчную паласу і сутыкнулася з адбойнікам, які прабіў аўтамабіль у раёне пярэдняга пасажырскага сядзення і выйшаў праз багажнік. На шчасце, у машыне нікога, акрамя кіроўцы, не было.

Кіроўца сур'ёзна не пацярпеў. Мужчына дастаўлены ў баранавіцкую бальніцу.

ПАРТРЭТ СКАНДАЛЬНАГА ВІЗІЦЁРА

Вось і запрашай такога ў госці...

Скандальны вядучы расійскага тэлеканала РТР **Уладзімір САЛАЎЁЎ** *(на фота зверху)*, як толькі з'ехаў з Мінска, стаў абвінавачваць беларускія спецслужбы і арганізатараў яго выступлення ў Палацы Рэспублікі ў спробах сарваць мерапрыемства. Пра гэта ён заявіў у эфіры маскоўскай радыёстанцыі "Вести ФМ".

Нагадаем: творчы вечар гэтага шоу-прапагандыста адбыўся 25 лістапада. За гадзіну да пачатку "спектакля" ля Палаца сабраліся некалькі дзясяткаў чалавек з плакатамі і нацыянальнымі сцягамі. Самыя актыўныя, у асноўным гэта былі сябры "Маладога фронту" (зарэгістраваны ў Чэхіі), раздавалі дыскі з інфармацыяй пра шоўмена. Яны даводзілі людзям, што чалавек, які ў з'едлівай форме крытыкуе Захад і ў той жа час мае дарагую вілу ў Іспаніі і даволі часта там адпачывае, крывадушнічае, лье ваду на млын маскоўскіх імперцаў.

Маладыя людзі час ад часу скандзіравалі: "Чамадан! Вакзал! Расія!", "Расія – гэта вайна". Чаму час ад часу? Таму, што некалькі дзясяткаў супрацоўнікаў АМАПа ў цывільным перыядычна спрабавалі схапіць таго ці іншага ўдзельніка акцыі, вырваць з рук сцяг. У такой сітуацыі людзям даводзілася адбівацца ад рук АМАПаўцаў і перамяшчацца з месца на месца.

Лідару "Маладога фронту" Зміцеру Дашкевічу дасталося і па твары, і па галаве, і па нагах *(у цэнтры на ніжэйшым здымку)*. Карацей, усё было як звычайна на акцыях. Неўзабаве на ганку ў атачэнні аховы з'явіўся сам Уладзімір Салаўёў. *"Ой, а гэтыя людзі ў курсе, што гэты лозунг "Чамадан. Вакзал. Расія" насамрэч належыць Жырыноўскаму? Яны што – ЛДПРаўцы? Не?! Гэта дзіўна".* На просьбу маладой журналісткі Кацярыны Андрэевай пракаментаваць яго стаўленне да гэтай акцыі, Салаўёў адказаў пытаннем: *"А вы, дзяўчына, хто па нацыянальнасці? Ну хто? Вось я, напрыклад, яўрэй. А вы? Вы беларуска? Хто?! Беларуская журналістка? Не, вы беларуска ці хто?"* У адказ: *"Слухайце, вы нармальны? Вы другі раз за дзень мяне абражаеце. Я яўрэйка, калі вам цікава".*

На заўвагі калег Андрэевай, што трэба было б папрасіць прабачэння ў дзяўчыны, Салаўёў адрэагаваў з істэрычнымі нотамі ў голасе: *"Ой, скажыце, калі ласка, абразілі дзяўчыну!"* А яшчэ крыху пазней ён раптам пачаў выкрыкваць: *"А дзе тая дзяўчына, якая саромеецца свайго яўрэйства?"* Усе адказы адыёзнага Салаўёва звяліся чамусьці да яго нацыянальнасці. На пытанне *"Які сэнс вы ўкладваеце ў паняцце "русский мир?"* Салаўёў адказаў: *"Русский мир" – гэта культура. А я яўрэй. Зразумела?"*

Шчыра кажучы, задаваць іншыя пытанні папросту расхацелася. Хаця шмат хто з журналістаў хацеў спытаць пра змяненне рыторыкі ў дачыненні да Беларусі. Апошнім часам на расійскіх каналах прайшлі некалькі крытычных сюжэтаў, у якіх негатыўна асвятлялася беларуская гісторыя.

У канцэртнай зале было шмат вольных месцаў. Пасля прыезду ў Маскву Уладзімір Салаўёў даволі своеасабліва патлумачыў адсутнасць цікавасці да ягонай персоны: *"За тры дні на трох з чатырох інтэрнэт-сайтах, якія займаюцца продажамі, раптам напісана, што білеты купіць нельга. У апошні дзень пачынаецца актыўнае вяртанне білетаў. Забаўныя рэчы. Людзі пыталіся лішні білецік, а арганізацыя палаца зрабіла ўсё магчымае, каб білеты немагчыма было купіць. Што хацелі сказаць?"*

Намеснік кіраўніка аддзела дзяржаўных і спецыяльных культурна-відовішчных мерапрыемстваў Палаца Рэспублікі **Ірына Арцімовіч** патлумачыла:

– Мы – камерцыйнае прадпрыемства, і мы самі будзем наносіць сабе ўрон? Ну, пакуль жа мы яшчэ не стацілі здаровы сэнс. Мы на такія абвінавачанні нават не будзем рэагаваць. Мы зацікаўлены, каб прадаць як мага больш квіткоў. Ніякага распаўсюджвання квіткоў не было. Гэта ж камерцыйны праект. Распаўсюджванне квіткоў можа сабе дазволіць толькі Мінгарвыканкам, калі, напрыклад, праводзяцца Дні культуры. Вось на Дні Санкт-Пецярбурга яны распаўсюджвалі квіткі. Ганарар Салаўёву мы заплацілі ў поўным аб'ёме – столькі, колькі ён заявіў. Суму, натуральна, я назваць не магу. Падаткі вылічылі, далі даведку, што ўтрымалі падатак на нашай тэрыторыі. Тое, што ён цяпер кажа, – звычайны папулізм. Яму, відаць, гэта падабаецца. Калі б гэта пагражала нам фінансава, то тады мы прад'явілі б яму прэтэнзіі. А так... Сабака брэша, караван ідзе.

– Можа, Салаўёў разлічваў, што будзе значна больш ахвотных прыйсці на сустрэчу з ім?

– Мы таксама думалі, што прададзім большую колькасць квіткоў. Колькі прадалі, столькі прадалі. Немагчыма такое, каб чалавек набываў квіток праз інтэрнэт і, калі яны былі ў наяўнасці, то не змог яго набыць. У касе касірка адзінае што можа зрабіць, дык клікнуць мышкай не туды і паказаць, што квіткоў няма. Але навошта? Тэарэтычна нехта мог забраніраваць вялікую колькасць. Але тады гэта планавая акцыя, але гэтага ж не было.

– Ну, на Познера ж у свой час прыйшло значна больш народу.

– Ну!.. Тады была крыху іншая сітуацыя. А цяпер кошт квіткоў такі ж, а заробкі іншыя. Сёння ў пятнічны вечар людзям хочацца глядзець забаўляльныя шоу, а не напружваць свае мазгі.

– Салаўёў кажа, што людзі здавалі квіткі.

– Прымусіць чалавека здаць квіток немагчыма. Але даволі часта здаюць квіткі ў касу. Жыццёвыя абставіны – нехта захварэў, трэба ісці ў госці, перадумаў ці яшчэ нешта. З касірам учора размаўлялі на гэты конт, і яна сказала, што гэта звычайная справа.

Спадар Салаўёў паскардзіўся не толькі на арганізатараў мерапрыемства. Ён абвінаваціў беларускія спецслужбы ў тым, што яны за ім увесь час сачылі. *"Куды ні пайду – адчуваю, што не адзін. Увесь час яшчэ вельмі інтэлігентныя людзі. Вельмі добры кіроўца, вельмі ветлівы, усё расказвае, усё ў яго добра – але на пінжаку пагоны проста праступаюць. Усё міла, але ніхто не спрабуе сказаць лішняга. Усе, калі нешта кажуць, адразу да "мікрафона" паварочваюцца ў любым памяшканні",* – сказаў у эфіры расійскі вядучы.

На гэтым фоне не дзіўна, што беларускіх журналістаў недзяржаўных выданняў і апазіцыянераў сп.Салаўёў увогуле назваў пачварамі. Ці не заслугоўвае гэтага слова ён сам?

Цяпер зразумела, што важ расійскага прапагандыста ў беларускую сталіцу быў абумоўлены не толькі камерцыйнымі інтарэсамі. Ён меў шэраг сустрэч, але нам нічога невядома пра іх мэту. Магчыма, ён разлічваў на больш цёплы прыём. Можа, ён не ў курсе, што яго аўтарскія праграмы "Поединок" і "Воскресный вечер с Владимиром Соловьевым" выклікаюць неадназначную рэакцыю ў тэлегледачоў. Адны абураюцца тым, што вядучы і заўсёднікі яго праграм не даюць выказацца апанентам, даволі часта абражаюць запрошаных гасцей, часам не абыходзіцца і без рукапрыкладства. Прынамсі гледачы бачылі напад на ўкраінскага палітолага Вячаслава Коўтуна. Другія лічаць, што Салаўёў самы адукаваны ідэолаг так званага "русского мира" і ў сённяшніх расійскіх рэаліях мае права на эфірны час.

Запрашэнне ў Беларусь расійскага, скажам прама, тэлекілера Салаўёва было ўзгоднена з ідэалагічным упраўленнем Мінгарвыканкама. Відаць, там не падумалі, што нехта здолее зладзіць акцыю на прыступках Палаца. У той дзень абышлося без затрымання і складання пратаколаў. Праўда, цяперашняя практыка сведчыць, што пратаколы могуць скласці і ў іншы дзень. Быў бы адпаведны загад.

У нядзелю ўначы беларускім гледачам расійскі тэлеканал прапанаваў чарговае шоу "Воскресный вечер с Владимиром Соловьевым". Гэтым разам тэмай дыскусіі была асоба нябожчыка Фідэля Кастра. Жырыноўскі ды іншыя ўдзельнікі "дыскусіі" на поўным сур'ёзе вырашалі, ці патрэбна ім Куба. Сапраўды хвалюючае для Расіі пытанне!

Любоў ЛУНЁВА.

ШОУ-БІЗНЕС

Хто паедзе на «Еўрабачанне»?

У фінал нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне-2017» трапіла адна беларускамоўная песня – «Гісторыя майго жыцця». Яе выконвае гурт NAVI.

Фіналістамі нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне-2017» сталі 13 выканаўцаў.

Фінал адбору пройдзе не пазней за 25 студзеня ў фармаце тэлевізійнага канцэрта. Удзельнік фіналу, які набраў найбольшую колькасць балаў па выніках галасавання прафесійнага журы і глядацкага галасавання, аб'яўляецца пераможцам праекта і становіцца афіцыйным прадстаўніком Беларусі на Міжнародным конкурсе песні «Еўрабачанне-2017». Вось тыя, хто будзе змагацца за паездку на "Еўрабачанне":

Аляксандра Ткач; Kattie (Кацярына Рудніцкая); Уладзіслаў Курасаў; гурт NAVI; Анжаліка Пушнова; Isaac Nightingale (Вадзім Капусцін); Настасся Шаверанка; «Июль» (Юлія Каранюк); Nuteki; Napoli; Lermont x Julic; гурт «PROвокация»; Мікіта Ходас.

Як звычайна, калямузычная грамадскасць засталася незадаволена вынікамі адбору. Маўляў, грошы патрацілі, а яскравых нумароў няма, а значыць, няма і надзеі на перамогу.

"*Беларусі даўно трэба прыняць прыклад некаторых краін і перастаць пасылаць ганцоў на гэты конкурс*, – так выказаўся наконт нацыянальнага адбору лідар гурта "Нейра Дзюбель" **Аляксандр Куллінковіч**. – *Бо мы не ставім сабе на мэту перамогу. Проста нам прышпільна там удзельнічаць. Калі б мы моцна хацелі перамагчы (уявім сабе калектыўны розум), то даўно паехалі б іншыя выканаўцы. І перамаглі, ёсць каму*".

Вера ВІР.

НУ І НУ!

Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі абвінаваціў міліцыю ў крадзяжы

Празаіка Анатоля Кудласевіча і паэта Паўла Шруба затрымалі пасля банкета ў рэстаране гасцініцы «Вікторыя» на праспекце Пераможцаў. Пасля таго як сябраў Саюза пісьменнікаў адпусцілі з міліцыі, Кудласевіч абвінаваціў міліцыю ў крадзяжы. ГУУС Мінгарвыканкама праводзіць праверку.

29 лістапада ў Мінску прайшоў з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшынёй быў пераабраны Мікалай Чаргінец. Пасля з'езда ў рэстаране праходзіў банкет. Калі Анатоль Кудласевіч і Павел Шруб сышлі з мерапрыемства, на вуліцы іх затрымалі супрацоўнікі міліцыі.

Як распавёў Анатоль Кудласевіч на сваёй старонцы ў Facebook, у міліцыі яго пратрымалі каля 20 хвілін, абшукалі, пратакол не складалі.

Пасля таго як пісьменнікаў адпусцілі з міліцыі, Кудласевіч заявіў, што ў міліцыі яго абакралі.

«10 беларускіх рублёў было ў кішэні і 12 долараў, якія некалькі гадоў вазіў у пашпарце як НЗ – так і не знайшоў. Прафесійна працуе наша міліцыя, якая нас ахоўвае, не пагрэбавалі нават пальчаткамі. Ганьба!», – напісаў літаратар.

У міліцыі абвінавачанні Кудласевіча не пакінулі па-за ўвагай.

«Нягледзячы на тое, што гэтая інфармацыя была размешчана грамадзянінам Кудласевічам на ўласнай старонцы ў Facebook (ён не звяртаўся з заявай ні ў РУУС, ні па тэлефоне «102»), публічныя абвінавачанні супрацоўнікаў міліцыі ў крадзяжы грошай і іншых рэчаў – пытанне вельмі сур'ёзнае, і мы не пакінем яго без увагі», – цытуе tut.by прэс-сакратара ГУУС Аляксандра Ластоўскага.

Прадстаўнік сталічнай міліцыі расказаў, што па гэтым факце ўжо распачата праверка, у рамках якой Кудласевіч будзе апытаны.

«Мы паведамім пра яе вынікі», – запэўніў Ластоўскі.

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

У бальніцу – на верталёце

На тэрыторыі буйных бальніц Мінскай вобласці з'явяцца верталётныя пляцоўкі.

Будаўніцтва такіх пляцовак – патрабаванне Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Ужо пачаліся работы па будаўніцтве першай такой пляцоўкі пры Мінскай абласной клінічнай бальніцы. Як патлумачыў старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама **Сяргей Трусаў,** «паркоўка для верталёта» дазволіць нашмат хутчэй дастаўляць цяжкахворых і пацярпелых у аварыях для аказання экстраннай медыцынскай дапамогі.

Дарэчы, у праекце кардыяхірургічнага цэнтра пры МОКБ, які разглядаўся некалькі гадоў таму, верталётная пляцоўка павінна была размяшчацца на даху цэнтра. Гэта дазволіла б сэканоміць 15–20 хвілін першай гадзіны ў экстранных сітуацыях. Не выключана, што дэпутаты Мінскага абласнога Савета дэпутатаў яшчэ вернуцца да разгляду гэтага праекта.

РОЗДУМ

Іван МАКАЛОВІЧ

Калі беларусы будуць слухаць Дзявятую сімфонію Бетховена?

Вось ужо больш за 70 гадоў у Краіне ўзыходзячага сонца напярэдадні Новага года гучыць гэты несмяротны твор. Усё пачалося з таго памятнага летняга канцэрта 1944 года, які адбыўся з нагоды адпраўкі на фронт выпускнікоў Такійскага ўніверсітэта.

У краіне быў голад. І музыканты настолькі аслаблі, што змаглі выканаць толькі дзве часткі сімфоніі Бетховена. На думку арганізатараў канцэрта, Дзявятая сімфонія павінна была ўзняць маральны дух маладых прызыўнікоў.

У тыя ракавыя дні музыка Бетховена мела асаблівае гучанне. Яна выклікала то радасць, то неспакой, то абуджала ўспаміны і нараджала глыбокія думкі. Японцы, адчуваючы, што краіна цярпіць паражэнне ў Другой сусветнай вайне, моцна задумаліся: а ці туды ідзе дзяржава? Як жыць далей?

Музыка геніяльнага кампазітара і гэтыя пытанні моцна заселі ў душах людзей і не давалі ім спакою. З таго часу напярэдадні кожнага Новага года японцы слухаюць Дзявятую сімфонію Бетховена і разважаюць, спрачаюцца аб будучым, аб тым, як жыць далей. Ці не таму іх краіна, не маючы амаль ніякіх карысных выкапняў і пастаянна перажываючы землятрусы і разбурэнні, стала трэцяй эканамічнай сілай у свеце.

Час і нам, беларусам, слухаць Дзявятую сімфонію Бетховена і сур'ёзна задумацца над пытаннем: "А ці туды ідзём?" Ці не час наладзіць агульнанацыянальную дыскусію па абмеркаванні лёсавызначальных праблем?

А пакуль такога няма, давайце самі пашукаем адказы на самыя вострыя пытанні. На тыя, якія не даюць нам спакою, але якія неахвотна закранаюць прадстаўнікі ўлады і іхнія палітолагі.

Вось яны, гэтыя пытанні. Ці дакладней – некаторыя з іх.

Суседзі ў рай, а мы – зноў у пекла?

Чаму народныя масы не ідуць за апазіцыяй?

Дзе нашы Эрхард ці Тэтчэр?

У Еўропе на выбарах спаборнічаюць партыі, а ў нас – швачкі-матарысткі і старшыні калгасаў. Чаму?

Ці стануць Амерыка і Англія суб'ектамі Расійскай Федэрацыі?

Чаму авечка з усяе сілы пнецца ў ахоплены полымем хлеў?

Іслам у Еўропе: пухліна ці бальзам?

Хто страшней: тэрарысты ці дыктатары?

Чаму той, хто не ведае гісторыі сваёй краіны, вымушаны будзе яшчэ раз перажыць яе кашмары?

Чаму Еўропа пускае ў свой край мусульман і закрывае дзверы перад беларусамі?

Ці можна вылечыць грамадства з дапамогай хлусні?

Натоўп і ўлада

Нярэдка чуем: "Як змяніць жыццё да лепшага, калі людзі ў нас пасіўныя, не хочуць бараніць свае правы, не ходзяць на мітынгі, не галасуюць на выбарах за апазіцыю?"

Мой адказ такі.

Калі вы чыталі Біблію, то ведаеце, як сустракалі Ісуса Хрыста ў Іерусаліме.

Ён прыехаў у горад на асле. Не на белым кані, як звычайна гэта рабілі цары пасля выдатных перамог. Ён ехаў як звычайны грамадзянін. Але як яго сустракаў натоўп! Тысячы людзей здымалі сваё адзенне і рассцілалі на дарозе, скандзіруючы "Слава! Хвала Усявышняму!". Яны гатовы былі ісці за ім на край свету.

А ўсяго праз некалькі дзён гэты самы натоўп крычаў: "Распяць яго!"

Як вядома, Ісусу Хрысту здрадзілі і яго арыштавалі.

Паводле звычаю, на Вялікдзень рымскі намеснік Іудзеі адпускаў аднаго з арыштаваных. І калі на плошчы з'явіўся вялізны натоўп цікаўных, пракуратар Пілат паведаміў, што ў турме ўтрымліваюцца разбойнік Варава і нехта Ісус, якога называюць Хрыстом. "Каго хочаце, каб я вызваліў?" – спытаўся Пілат. "Вараву, Вараву!" – гуў натоўп. Пракуратар пацікавіўся, што рабіць з Ісусам. "Распяць яго! Распяць!" – крычалі з натоўпу. "А чаму? Ён жа не зрабіў нічога кепскага?" – недаўмяваў Понцій Пілат. Натоўп яшчэ мацней закрычаў: "Распяць яго!"

Чаму любоў і пакланенне змяніліся гневам і злосцю? А вось чаму. Напярэдадні прыезду ў Іерусалім Ісус прадэманстраваў нябачаную раней сілу. Ён вярнуў зрок сляпым, ажывіў мёртвага. Весткі аб гэтым разляцеліся па акрузе. І людзі пацягнуліся за Хрыстом са сваімі бедамі і праблемамі з надзеяй, што ён дапаможа вырашыць іх.

А калі яго арыштавалі і з яго здзекаваліся ахоўнікі, натоўп зрабіў выснову, што яго сіла знікла. "Бачыце, ён не можа абараніць сябе", – шапталіся гараджане.

А каму такі патрэбны? Натоўп прагне бачыць моцнага. Як разбойнік Варава. Ён можа, калі спатрэбіцца, каму хочаш даць у морду. А той, Ісус, зусім бездапаможны.

Якая выснова з біблейскай прыпавесці напрошваецца? За апазіцыяй, якая ў Беларусі толькі падстаўляе спіны пад дубінкі, натоўп ніколі не пойдзе. Натоўп, народныя масы, электарат ідуць за моцнымі. Так было заўжды і ва ўсіх народаў.

Успомнім: на пачатку мінчане паверылі апазіцыі і тысячамі хадзілі за яе прадстаўнікамі па вуліцах. Ды сярод гэтых прадстаўнікоў не знайшлося ні свайго Валенсы, ні свайго Гавела, ні нават Саакашвілі... І натоўп расчараваўся ў такіх лідарах.

У Еўропе на выбарах спаборнічаюць партыі, у нас – швачкі-матарысткі і старшыні калгасаў

Гэта галоўнае адрозненне нашых выбарчых кампаній ад еўрапейскіх. Нават у Расіі палова дэпутатаў Дзяржаўнай Думы выбіраецца па партыйных спісах. Чаму?

Праграму вываду краіны з крызісу не могуць распрацаваць ні спявачка, ні старшыня ўчарашняга калгаса (а сённяшняга СВК ці ААТ), нават калі яны перадавікі ў сваіх галінах. Гэта пад сілу толькі эканамістам і палітыкам, якія кучкуюцца ў партыях, а не на жывёлагадоўчых фермах.

Урад, як вядома, зацвярджаецца парламентам. У нас "дэпутаты з народа" адзінадушна галасуюць за тых, каго ім прапаноўваюць. Прозвішчы некаторых яны наогул упершыню чуюць, а таму для іх няма розніцы, хто якую пасаду зойме ў вышэйшым эшалоне ўлады.

Дзеяздольны, высокакваліфікаваны ўрад могуць сфарміраваць толькі палітычныя партыі. Таму што іх галоўная мэта – узяць уладу ў свае рукі. А каб гэта стала рэальнасцю, трэба, каб у партыях былі аўтарытэтныя асобы, якія дзякуючы сваёй харызматычнасці, сваім арганізатарскім здольнасцям і прафесійным якасцям выклікаюць глыбокую павагу ў шырокай грамадскасці. І партыі імкнуцца мець у сваіх шэрагах такіх лідараў.

Нялішнім будзе нагадаць, якія абяцанні даюць выбаршчыкам "вылучэнцы з народа": адрамантаваць дзіцячы садок, пабудаваць мост праз рачулку... Стаўшы дэпутатамі, яны пачынаюць дабівацца выканання сваіх абяцанняў. Іх хвалюе не будаўніцтва краіны, чым павінен займацца парламент, а будаўніцтва мастоў, ферм. Словам, як ні круці, "вылучэнцы з народа" прайграюць ва ўсім тым неардынарным асобам, прозвішчы якіх уносяць у свае спісы партыі.

Затое "дэпутатамі з народа" лягчэй кіраваць. Аднаму можна пасадзейнічаць у вырашэнні нейкай важнай для яго праблемы, другога ўключыць у склад дэлегацыі, якая ад'язджае за мяжу, трэцяму намякнуць, што яго кандыдатура можа з'явіцца ў спісе вылучэнцаў на важную пасаду... Глядзіш, і парламент стаў "ручным". Ён ахвотна штампуе законы, патрэбныя прадстаўнікам улады. Ён служыць ужо не народу, а купцы палітыканаў.

Менавіта ператварэнне выбарчага працэсу ў спаборніцтва партый дапамагло пабудаваць сучасную Еўропу і сучасную Амерыку.

У нас жа партыі называюць "пятай калонай" і ім па-ранейшаму перакрываюць дарогу ў парламент.

(Працяг у наступным нумары.)

НЕСТАНДАРТ

Кава з беларускім прысмакам

Не так даўно ў Беларусі даволі паспяхова стартаваў праект у падтрымку беларускай літаратуры MOVABOX. У Мінску з сярэдзіны лістапада з'явіліся 10 кніжных боксаў з творамі сучасных беларускіх пісьменнікаў. Цяпер пагартаць старонкі добрых кніг на роднай мове можна ў кавярнях Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна, Магілёва і Мазыра.

Буккросінг – гэта грамадскі рух, які ўяўляе сабою абмен кнігамі паміж незнаёмымі людзьмі. Кожны яго ўдзельнік можа пакінуць кнігу, якой хоча падзяліцца, у спецыяльна абазначаным месцы і замест яе ўзяць любую іншую. Па ініцыятыве кампаніі velcom кніжныя боксы для буккросінгу, на якіх змяшчаюцца кнігі з творамі сучасных беларускіх аутараў, усталяваны ў папулярных кавярнях гарадоў Беларусі.

Першымі сваё месца ў боксах для буккросінгу занялі кнігі Людмілы Рублеўскай з цыкла аб прыгодах Пранціша Вырвіча – «Авантуры студыёзуса Вырвіча» і «Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча». Менавіта творам гэтай пісьменніцы прысвечаны першы MOVABOX – унікальны набор, у які ўваходзяць кніга і звязаныя з ёй артэфакты.

MOVABOX робіць акцэнт на творчасці прадстаўнікоў сучаснай беларускай літаратуры. Таму ў боксах таксама прадстаўлены такія кнігі, як раман Юрыя Станкевіча «Паўночны вецер для спелых пладоў», зборнік літаратурных эсэ Андрэя Федарэнкі «Сечка», калекцыя літаратурных замалёвак ад Адама Глобуса пад назвай «Партрэты».

«Творы сучасных беларускіх аўтараў сапраўды вартыя таго, каб іх чыталі і дзеці, і дарослыя – як вартая таго і беларуская літаратура ўвогуле, – адзначае Вячаслаў Смірноў, кіраўнік аддзела карпаратыўных камунікацый кампаніі velcom. – *Стартам беларускамоўнага буккросінгу ў праекце MOVABOX мы імкнёмся дапамагчы кнігам прыйсці да свайго чытача, незалежна ад таго, жыве ён у сталіцы, дзе сёння засяроджаны асноўныя падзеі літаратурнага жыцця, ці ў іншых гарадах. Яшчэ адна наша мэта – паказаць усю разнастайнасць і шматграннасць беларускага літаратурнага працэсу. Спадзяёмся, што праз некаторы час гэтая калекцыя папоўніцца не менш цікавымі экзэмплярамі – магчымасць зрабіць свой унёсак у развіццё праекта мае кожны».*

